

Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б
і аблвыканкома.

№ 69 (138) | Нядзеля, 24 сакавіка 1940 г. | Цана 10 капеек



Галасуйце за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных!

Настаў доўгачаканы радасны дзень, калі мільёны выбаршчыкаў вызваленых заходніх абласцей на аснове самай дэмакратычнай Сталінскай Канстытуцыі прыдуць да выбарчых урнаў і свабодна выберуць сваіх прадстаўнікоў у вышэйшыя органы ўлады соцыялістычнай дзяржавы.

Ідучы на выбарчы ўчастак, кожны выбаршчык, кожны рабочы, служачы, селянін і інтэлігент яшчэ раз абдумае ўсе годы свайго жыцця ў панскай Польшчы — турме народаў і поўгода жыцця ў брацкай сям'і народаў вялікага Совецкага Саюза. Кожны яшчэ раз падумае, якая была перспектыва яго далейшага жыцця, *калі-б панская Польшча* не развалілася, і якая перспектыва яго жыцця ў краіне Советаў, стваpаючай комуністычнае грамадства.

Гэтыя мыслі, гэтыя паралелі сёння выказваюць уголас на старонках нашай газеты прадстаўнікі розных катэгорый працоўных.

Рабочы Пісарэвіч расказвае, што нязносная эксплаатацыя, штрафы і здзекі прымусілі іх аб'явіць акупацыйную забастоўку. 6 месяцаў рабочыя не выходзілі з фабрыкі, галадалі, падвяргаліся збіванням паліцыі і шпікаў, але рабочыя не здаваліся, змагаючыся за мізэрныя чалавечыя правы. Зараз рабочы Пісарэвіч кіруе фабрыкай. Праца стала радаснай і прадукцыйнай. Фабрыка выканала план на 103 процанты. Наперадзе адкрываюцца велічныя перспектывы соцыялістычнага будаўніцтва, і тав. Пісарэвіч, як і тысячы другіх рабочых, будзе галасаваць сёння за сваё шчаслівае жыццё, за партыю *Леніна—Сталіна, за кандыдатаў ста*лінскага блока комуністаў і беспартыйных.

Селянін Антон Пулькоўскі з вёскі Залясяны расказвае, што ён 7 год працаваў на памешчыка, каб скапіць хоць некалькі грошай і купіць невялікі загончык зямлі. Але яму гэта не ўдавалася. Толькі совецкая ўлада дала яму бясплатна 4 гектары зямлі, карову, перасяліла з поўразбуранай хаты ў кватэру былога памешчыка. «Я пайду сёння, — гаворыць селянін Пулькоўскі, — да выбарчай урны, каб выказаць удзячнасць вялікаму Сталіну. Я буду галасаваць за сваю радасць, за радасць мільёнаў працоўных. Я аддам свой голас за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных». Гэта — мыслі ўсяго сялянства, вызваленага з цяжкага ярма эксплаатацыі памешчыкаў, асаднікаў і кулакоў.

— Я ўрач, — расказвае тав. Высоцкі. — З найвялікшымі цяжкасцямі я змог скончыць вышэйшую навучальную ўстанову ў былой Польшчы. Дыплом я атрымаў, а перспектыў на атрыманне работы не было. Мяне не прымалі на работу за тое, што я яўрэй. Зараз тав. Высоцкі працуе хірургам у 2-й гарадской бальніцы. Смела і радасна глядзіць ён у сваё будучае. Яму забяспечан поўны росквіт яго здольнасцей. Ён з радасцю гаворыць аб увазе совецкай улады да самага каштоўнага капітала — людзей, да іх здароўя. У абласці адкрыты дзесяткі новых бальніц, паліклінік, урачэбных пунктаў. Тое, што польскія паны не зрабілі за 20 год, совецкая ўлада зрабіла за поўгода. Сваім шчаслівым жыццём, піша тав. Высоцкі, мы абавязаны партыі большэвікоў. Вось чаму я буду галасаваць за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

Польская дзіцячая пісьменніца тав. Бранеўская піша: Шэсць месяцаў таму назад я мела «воўчы білет» як педагог і як пісьменніца. Толькі ў СССР я магу быць вольным грамадзянінам, магу пісаць тое, што думаю, не баючыся паліцэйскай цэнзуры, якая вісела агідным мечам над кожным дэмакратычным пісьменнікам... Я напісала сваю шостую па ліку і першую па паўнаце выражэння сваіх пачуццяў кнігу. З гордасцю і ўдзячнасцю я прыду сёння да выбарчай урны і аддам свой голас за лепшых сыноў і дачок народа, за кандыдатаў сталін*скага блока комуністаў і беспартыйных*.

Хвалюючыя патрыятычныя думкі выказалі ў сваіх пісьмах 73-гадовы старык Зуц Ілья і 18-гадовыя юнакі Скакоўскі і Шаўзіна.

Стары рабочы Зуц 57 год працаваў на фабрыцы, аддаў усё сваё жыццё на ўзбагачэнне фабрыканта і не ўдастоіўся на старасці год атрымаць пенсію. Яму пагражала галодная смерць. Толькі совецкая ўлада забяспечыла яму, як і тысячам другіх, шчаслівую старасць. Сваё пісьмо Зуц заканчвае словамі: Старыкі і старухі, усе як адзін, галасуйце за сталінскіх кандыдатаў, за нашу шчаслівую старасць!

18-гадовыя грамадзяне Скакоўскі і Шаўзіна пішуць: Мы навучаемся ў школе бясплатна. Увосень гэтага года мы зможам паступіць у любую вышэйшую навучальную ўстанову Совецкага Саюза. Няма ў свеце моладзі *шчаслівейшай за нас... Мы з гордасцю будзем галасаваць* за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных, за наша новае жыццё, за наша шчасце, за партыю Леніна—Сталіна.

Такавы мыслі свабодных грамадзян, з такімі радаснымі пачуццямі яны ідуць сёння да выбарчых урнаў і з гордасцю выканаюць свой свяшчэнны доўг перад радзімай. Няма ніякага сумнення, што вынікі выбараў з'явяцца яркай дэманстрацыяй любві народаў да радзімы, да партыі, да любімага Сталіна.

Усе на выбары! Не можа быць ні аднаго выбаршчыка, які-б не выканаў свой свяшчэнны доўг перад радзімай! Галасуйце за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных! Галасуйце за сваё радаснае, свабоднае жыццё! Галасуйце за сваю шчаслівую будучыню!



Рысунак Э. Гольдберга

ПАВ. ГЕРМАН

24 МАРТА

Это будет все, я знаю,
В серебристый ясный день.
В этот день я, избирая,
Получу свой бюллетень.

Прежде чем свой долг исполнить,
Опустить листок тугой,
Память мне моя напомнит
Годы прожитые мной.

Силу родины и славу,
Бег невиданных минут,
Неот'емлемое право
И на счастье и на труд.

И того, кто дал нам это,
Научил, как надо жить,
И сумел страну Советов
Песнями вооружить.

В этот светлый день, хрустальный,
Улыбающийся день,
Миллионы скажут: СТАЛИН.
Опуская бюллетень.

Белосток, 1940 г.

Дэпутат--пасланец і верны слуга народа

... Перада мной дзесяткі толькі што атрыманых пісем. Пошта дастаўляе іх кожны дзень. Чытаючы пісьмы, я бачу сваіх выбаршчыкаў, іх патрэбы, запатрабаванні: яны даюць мне парады, уносяць прапановы.

Вось пісьмо выбаршчыцы тав. Качоткавай. Яна дзякуе за чуткасць, за аказаную ёй сур'ёзную медыцынскую дапамогу. У другім пісьме група работнікаў раёна гаворыць аб тым, што па маёй прапанове сельпо арганізавана і працуе, у трэцім—скарга аб парушэнні рэволюцыйнай законнасці. Я адношуся да кожнага слова, накіраванага да мяне, уважліва, з увагай велізарнай адказнасці за сваё рашэнне па кожнаму пісьму, кожнай скарзе. За час дэпутацкай дзейнасці я атрымаў каля 1800 пісем. Наўрад ці гэтым можа пахваліцца любы дэпутат любога парламента, няхай нават самай „дэмакратычнай" краіны! Іменна таму, што толькі нашы дэпутаты з'яўляюцца сапраўды народнымі прадстаўнікамі, яны так моцна звязаны са сваімі выбаршчыкамі, з народам. І толькі таму адчуваеш, на колькі вялікa аказанае давер'е, на колькі ты адказны перад народам у сваёй дзяржаўнай, дэпутацкай дзейнасці.

Мне прыходзіцца сутыкацца з мноствам пытанняў. Тут і асабовыя скаргі, і пытанні грамадскага значэння. Звяртаюцца асобныя выбаршчыкі, цэлыя групы і калектывы. Адны просяць парады, другія звяртаюцца з прапановай, просяць падтрымкі ў вырашэнні тых ці іншых пытанняў. Гэта сапраўды народны ўніверсітэт. Іменна тут набываеш навыкі, вопыт дзяржаўнага дзеяча, пашыраеш свой кругазор, абагачаеш сябе мудрасцю кіраўніка.

Добра памятаю ўказанні нашага любімага правадыра народаў таварыша Сталіна аб тым, якім павінен быць дэпутат — слуга народа. І я стараюся ў сваёй дэпутацкай дзейнасці поўнасцю выканаць мудрыя ўказанні таварыша Сталіна. Гэты словы натхняюць мяне, даюць многа новых і новых сіл. Быць дастойным пасланцом народа, яго слугой, гэта самае высокае, дарагое ў жыцці.

Дэпутат соцыялістычнага парламента — гэта перадавы машыніст, слесар, ткач ці даярка, знатны аграном, артыст ці настаўнік. Толькі ў нашай краіне, азаронай Сталінскай Канстытуцыяй, магчым нябачаны творчы рост людзей, толькі ў нас кожны можа праявіць свае здольнасці, раскрыць свае таленты. І народ, пасылаючы сваіх прадстаўнікоў у вышэйшыя органы ўлады, упэўнен, што іх пасланцы навучацца дзяржаўнай мудрасці, будуць сапраўднымі дзеячамі ленінска-сталінскага тыпу.

Сёння вызвалены народ заходніх абласцей Беларусі перажывае найвялікшую радасць: ён выбірае дэпутатаў у вышэйшыя органы ўлады. Выкарыстоўваючы ўсе правы, прадастаўленыя Сталінскай Канстытуцыяй, працоўныя пасылаюць у соцыялістычны парламент сваіх верных сыноў і дачок. Хто яны, гэтыя кандыдаты ў дэпутаты? Хто яны, гэтыя таварышы: Прытыцкі, Турлейскі, Вайцэшук, Крук, Радзевіч і іншыя? Гэта людзі, чыё ўсё жыццё і барацьба прысвечаны народу, яго шчасцю, яго вызваленню ад іга памешчыкаў і капіталістаў. Гэта — кандыдаты сталінскага блока комуністаў і беспартыйных. І вызвалены народ заходніх абласцей, з'еднаны ў адзіную брацкую сям'ю народаў краіны соцыялізма, будзе сёння дружна галасаваць за сваіх кандыдатаў, за сваіх верных сыноў і дачок.

Гэтыя сапраўды народныя прадстаўнікі, падтрыманыя многалікімі мітынгамі і сходамі працоўных на выбарчых участках, дастойны насіць высокае і пачотнае званне дэпутата. Пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі яны будуць вучыцца дзяржаўнай мудрасці, будуць змагацца за шчасце народа, за далейшы росквіт і ўмацаванне магутнасці Радзімы.

Галасуйце, таварышы выбаршчыкі, за кандыдатаў сталінскага блока, за верных сыноў і дачок совецкага народа!

І. П. ЛАРЫОНАЎ,
дэпутат Вярхоўнага Совета СССР
намеснік начальніка чыгункі.









★

КАНДЫДАТЫ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР

У ПЕРШЫМ РАДУ:

Прытыцкі Сяргей Осіпавіч,
Кавалёў Міхаіл Пракоф'евіч,
Турлейскі Іван Антонавіч,
Ігаеў Сямён Сцяпанавіч.

У ДРУГІМ РАДУ:

Сеўко Павел Антонавіч,
Дз'ячук Марыя Іванаўна,
Пестрак Філіп Сямёнавіч.

★

У ЧЭСЦЬ ВЫБАРАУ

Калектыў тэкстыльнай фабрыкі № 29 выканаў да 15 сакавіка квартальны план па пражы на 104,4%, па ткацтву — на 120%. Рабочыя і ІТР мабілізуюць свае сілы, каб да 1-га красавіка даць звыш плана 26 тысяч метраў тканін.


Калектыў першага камбіната да 22 сакавіка выканаў квартальны план па пражы на 102%, па суравіне— на 100%.

У ЧЭСЦЬ ВЫБАРАУ

Рабочыя і ІТР тэкстыльнай фабрыкі № 23 да 20 сакавіка выканалі квартальны план па пражы на 108,5%, па суравіне на 109,6%.

Калектыў тэкстыльнай фабрыкі № 13 да 20 сакавіка даў краіне 150 тысяч метраў гатовых тканін замест 142 тысяч, прадугледжаных па плану.

Трэст будаўнічых матэрыялаў заходніх абласцей БССР да 20 сакавіка выканаў план першага квартала на 110%.



КАНДЫДАТЫ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОУНАГА СОВЕТА БССР (злева направа). Крук Сцяпан Леонцьевіч, Аляксееў Канстанцін Грыгор'евіч, Гершман Грыгорый Майсеевіч, Чэкель Владзімір Андрэевіч, Бялы Павел Іванавіч, Гайсін Вульф Боруховіч.

ГАВОРАЦЬ ВЫБАРШЧЫКІ

ЧАМУ МЫ СЁННЯ БУДЗЕМ ГАЛАСАВАЦЬ ЗА КАНДЫДАТАЎ БЛОКА КОМУНІСТАЎ і БЕСПАРТЫЙНЫХ

ЗА ШЧАСЦЕ СВАЁ І СВАІХ ДЗЯЦЕЙ

Калі ў доўгія ночы мы ляжалі на каменнай падлозе нашай фабрыкі, прыслухоўваючыся з напружаннем, ці не рыхтуецца новы налёт паліцэйскіх на нас, бастуючых рабочых, калі голад і холад знесілялі нашы арганізмы, мы марылі аб дні, калі для нас заблішчыць сонца новага жыцця.

Калі паліцэйскія пана Складкоўскага да крыві збівалі нашых жонак і матак, якія нам прынасілі кавалак хлеба, тады нашы кулакі сціскаліся і думкі працавалі, малюючы дзень помсты над нашымі злейшымі ворагамі, катамі рабочых і сялян.

18 год я працаваў ткачом на плюшавай фабрыцы мільянераў Бекера і Гайера ў Беластоку. Нязносныя штрафы, зрыў зарплаты, зверскія адносіны адміністрацыі прымусілі нас поўгода баставаць. За перыяд гэтай забастоўкі было многа афяр, але пасля 6 месяцаў гераічнай барацьбы фабрыканты і панскія ўлады не спынілі сваіх праследванняў супроць нас. Мяне, як старшыню забастовачнага камітэта, пазбавілі працы, а польскі суд прыгаварыў да турэмнага зняволення.

Два годы я хадзіў без работы, галадаў разам са сваёй сям'ёй цэлымі днямі, а калі атрымліваў работу на які дзень або два, тады трэба было насіць каменне па 14 гадзін за паўтара злотых у дзень. Я думаў аб дні, калі не будзе ўжо больш голада і беспрацоўя, праследванняў і прыгнёту.

І гэты дзень прышоў. Савецкая ўлада і Чырвоная Армія прынеслі нам свабоду, працу, хлеб, прыцягнулі нас да кіраўніцтва дзяржавай.

Які вялікі шлях пройдзен за апошнія 6 месяцаў. З першых дзён вызвалення нашай зямлі мяне выбіраюць у члены кантрольнай камісіі на тэкстыльнай фабрыцы Шпіра. Пасля таго вылучаюць загадчыкам фабрыкі, якая ўваходзіць у састаў 3-га тэкстыльнага камбіната.

Рабочыя лепш кіруюць фабрыкамі, чым капіталіст. Хоць наш калектыў менш на 30%, чым раней, мы даем больш прадукцыі, і план за папярэдні месяц выканалі на 103 працанты.

Хаця ў нас яшчэ нямала цяжкасцей, але я бачу радасныя твары. Мы, рабочыя, радуемся, бо будучае належыць нам. Савецкая ўлада нас падняла з самых нізоў. Мы былі нічым і сталі ўсім. Не знойдзецца ні аднаго рабочага, які сёння не стане ў рады мільёнаў, не пойдзе са сцягамі на выбары аддаваць свае галасы за лепшых сыноў народа, за шчасце сваё і сваіх дзяцей

Вл. Пісарэвіч,
рабочы — загадчык аддзялення 3-га камбіната.

СЛОВЫ ЎРАЧА

Сёння вялікі гістарычны дзень у жыцці кожнага з нас. Вызваленыя з-пад прыгнёту памешчыкаў і капіталістаў, мы пойдзем да выбарчых урнаў і будзем галасаваць на аснове самай дэмакратычнай у свеце Сталінскай Канстытуцыі.

У панскай Польшчы я байкатыраваў выбары. Я не хацеў прымаць удзел у гэтай агіднай камедыі, адзінай задачай якой было стварыць фікцыю, якая-б засланіла ўсю гніль пануючай клікі, рабства і эксплаатацыю працоўных мас, нацыянальны ўціск, палітычнае бяспраўе.

Па адукацыі я ўрач-хірург. Колькі перашкод прышлося мне перамагчы, каб папасці ва ўніверсітэт і атрымаць дыплом урача. У 1934 годзе мне ўдалося скончыць універсітэт, але на працягу двух год я не мог выкупіць дыплома, бо не меў сродкаў, каб аплаціць экзамены. Дыплом атрымаў, а перспектыў на атрыманне работы ніякіх. У беластоцкім шпіталі мне прама сказалі: „Ты яўрэй і разлічваць на пасаду ўрача ў нашым шпіталі не можаш".

17 верасня 1939 года гераічная Чырвоная Армія змяла пагранічныя слупы, якія аддзялялі народы Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны ад працоўных Савецкага Саюза. Я вярнуўся з Варшавы ў свой родны Беласток, у краіну сацыялізма. Я адразу атрымаў работу ў 2-й гарадской бальніцы. Смела і ўпэўнена гляджу я ў будучыню.

Толькі 6 месяцаў прайшло з моманту вызвалення народаў Заходняй Беларусі, а якія велізарнейшыя змены адбыліся ў нашым жыцці. На працягу гэтага кароткага перыяда мы дасягнулі таго, што не пад сілу было капіталістам і памешчыкам на працягу дваццаці год існавання. Тысячы людзей, асуджаных у былой Польшчы на беспрацоўе, на галодную смерць, атрымалі работу. Адкрыты сотні новых школ, у якіх навучаюцца дзесяткі тысяч дзяцей, пазбаўленых раней права на асвету. Адкрыты дзесяткі новых бальніц і іншых лячэбных устаноў, пабудаваны новыя палiклінікі, у якіх хворыя атрымліваюць бясплатную ўрачэбную дапамогу.

Сваім шчаслівым жыццём мы абавязаны мудрай, геніяльнай палітыцы таварыша Сталіна і партыі бальшэвікоў. Вось чаму я буду галасаваць за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

Я ўпэўнен, што выбары дадуць бліскучыя вынікі. Мы з чэсцю вытрымаем экзамен палітычнай спеласці.

Р. Высоцкі,
урач 2-й гарадской бальніцы.

ГАЛАСУЮ ЗА ШЧАСЛІВУЮ СТАРАСЦЬ

У апошнія годы перада мной вельмі часта ўзнікалі пытанні адносна майго жыцця. Іншы раз я начамі не спаў, а ўсё думаў: як прыдзецца дажываць свой век, хто дапаможа мне, калі не змагу хадзіць на фабрыку?

Мая старая, як-бы насміхаючыся над маім жыццём, гаварыла:

— Пайдзі да старасты, напішы прашэнне ваяводзе. Няўжо-ж ты нічога не заслужыў? Столькі стараўся, столькі мучыўся...

Ні да старасты, ні да ваяводы я не хадзіў. Прашэнняў таксама не пасылаў. Мне і без таго было вядома, што польскія паны не турбаваліся і не турбуюцца аб нашай старасці.

І я працаваў. Выбіваючыся з сіл, хадзіў на фабрыку, гнуў спіну над прадзільным станком. Ледзь-ледзь пракармліваў самога сябе і жонку старую...

Увосень 1939 года, як вядома, не стала польскіх панічоў. Да нас прышла Чырвоная Армія. Я даведаўся, што ў Савецкім Саюзе ёсць Сталінская Канстытуцыя, дзе запісана аб правах усіх грамадзян на матэрыяльнае забеспячэнне ў старасці. Пры выбарах у Народнае Сабранне я з радасцю прагаласаваў за савецкую ўладу, за Сталінскую Канстытуцыю.

З таго часу прайшло толькі поўгода. Але я ўжо дакладна ўпэўніўся, што расказы чырвонаармейцаў аб Сталінскай Канстытуцыі аказаліся справядлівымі. Нядаўна мне на фабрыцы сказалі:

— Хопіць, стары, працаваць. Даўным-даўно пара на пенсію!

Зараз, на 73-м годзе свайго жыцця, адпрацаваўшы 57 год на фабрыцы ў якасці рабочага-ткача, я са спакойнай душой пакінуў работу. Як грамадзянін Савецкага Саюза, пераходжу на пенсію, якую мне пачынае выплачваць савецкая дзяржава, згодна Сталінскай Канстытуцыі.

Цяпер я сплю спакойна, мяне не турбуюць ніякія пытанні адносна майго існавання. Цяпер інакш глядзіць на свет і мая старая.

Вось што азначае Сталінская Канстытуцыя і савецкая ўлада. За гэту Канстытуцыю, за гэту ўладу, за сваю шчаслівую старасць, за самога бацьку Сталіна аддаю свой голас на выбарах у Вярхоўныя Советы СССР і БССР. Разам з гэтым я жадаю сказаць на ўсю абласць: Старыкі і старухі! Усе, як адзін, галасуйце за сталінскіх кандыдатаў, за нашу шчаслівую старасць!

Зуц Ілья,
пенсіянер, былы рабочы-ткач фабрыкі № 23.

АД ВОСЕНІ ДА ВЯСНЫ

У дажджлівыя кастрычніцкія дні па мокрых дарогах пешшу і на фурманках тысячы людзей цягнуліся на ўсход. Я была сярод гэтых людзей, пазбаўленых прытулку, работы і сродкаў на існаванне. Мы ішлі з краіны смерці і разбурэння на вызваленую зямлю, зямлю, якая доўгія годы стагнала ў панскім ярме.

У дажджлівую асеннюю ноч адкрыліся перад намі гасцінна абшары нашай новай радзімы, радзімы працоўных усяго свету.

Адразу-ж я сустрэлася з такой прыветлівасцю, клопатамі і дапамогай, якіх мне ніколі ніхто не аказваў, якія можа даць толькі Радзіма-маці. Баец-чырвонаармеец у шэрым шынялі, які прыняў нас на парозе новага жыцця, партыйныя і савецкія органы, з якімі я сустрэлася ў Беластоку і Мінску, сардэчна клапаціліся аба мне.

Мяне не пужае беспрацоўе і бяздомнасць. Толькі тут, у СССР, я магу быць вольным грамадзянінам, магу пісаць тое, што думаю, не баючыся паліцэйскай цэнзуры, якая вісела агідным мечам над кожным дэмакратычным пісьменнікам у былой панскай Польшчы. Іменна тут збылася мая заветная мара дзіцячай пісьменніцы: я атрымала магчымасць працаваць у школе, трымаць цесную сувязь са сваім чытачом, удзельнічаць у выхаванні маладога пакалення. 6 месяцаў назад я мела „воўчы білет", як педагог і як пісьменніца, сёння я працую ў аддзеле народнай асветы. Саюз савецкіх пісьменнікаў даў мне магчымасць пабываць у Доме творчасці пад Мінскам. Там я напісала сваю шостую па ліку і першую па паўнаце выражэння сваіх пачуццяў кнігу.

З гордасцю і ўдзячнасцю я прыду сёння да выбарчай урны, каб выканаць доўг грамадзянкі вялікага Савецкага Саюза, аддаць свой голас за лепшых сыноў і дачок вызваленай беларускай зямлі, кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

У гэтыя вясеннія дні я адчуваю ўсё хараство новага жыцця. Якім далёкім і забытым здаецца мне той дажджлівы асенні дзень, калі я была чалавекам без прытулку, без работы, без сродкаў на існаванне. Я шчаслівая, што працую на карысць працоўнага народа.

Я ведаю, што радасць і гордасць перажываюць зараз усе мае таварышы-пісьменнікі. Я заклікаю іх усіх выканаць доўг грамадзяніна і аддаць свае галасы за лепшых сыноў народа, кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

Мы многім абавязаны савецкай уладзе. Свой доўг мы будзем аплачваць адданай, шчырай работай на працягу ўсяго свайго творчага жыцця.

Яніна Бравеўская,
польская дзіцячая пісьменніца.

★ ★ ★

ЗА СВЕТЛАЕ ЖЫЦЦЁ

Сёнешні дзень самы радасны, самы шчаслівы для мяне. Сёння я, як і ўсе працоўныя вызваленых заходніх абласцей, упершыню буду выбіраць сапраўды народных прадстаўнікоў у вышэйшы орган улады советаў.

Пры ўладзе памешчыкаў і капіталістаў мне давялося прымаць удзел у выбарах. Але што гэта былі за выбары? Аб іх я хачу сказаць некалькі слоў. Памятаю, калі пан мне даў канверт і паслаў галасаваць, загадаўшы не раскрываць канверта і не глядзець. За каго галасавалі — не ведалі. Вядома, за такіх кандыдатаў непрыемна было галасаваць.

Сям'я ў мяне — 8 душ. А зямлі 1,5 гектара. Многа з такой плошчы ўраджаю не збярэш. Каня не мелі. За адзін загон зямлі судзіліся тры разы. На суд ехаць муж наймаў фурманку. Дзеці мае гаравалі ў кулакоў за кавалак хлеба. Цяжка зараз аб гэтым гаварыць.

І вось, у той час, калі пагроза нагібелі, здавалася, вісела над галовамі беларускага народа, прышла наша вызваліцельніца — Чырвоная Армія. Мы ўздыхнулі поўнымі грудзьмі, выпрасталі спіну. Развеян упрах стары, ненавісны лад прыгнечання і няволніцтва. І не вярнуцца яму больш ніколі!

Мы ў сваёй вёсцы арганізавалі калгас. Я адной з першых уступіла ў яго. У маім жыцці — дзве старонкі. Адна — шэрая, цёмная, поўная бядот, страху; другая — ясная, сонечная. Гэта другая —мае цяперашняе жыццё, жыццё ўсіх працоўных жанчын, усяго народа. І вось за гэта светлае жыццё, за савецкую ўладу, за дарагога Сталіна я буду сёння галасаваць.

К. Тафіля,
калгасніца калгаса імені Варашылава, Заблудаўскага раёна.

★ ★ ★

БУДУ ГАЛАСАВАЦЬ ЗА РАДАСЦЬ ПРАЦОЎНЫХ

З вялікай радасцю я сустракаю дзень выбараў дэпутатаў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР. Мне цяжка падабраць словы, каб перадаць радасць і пачуцці, якія запаўняюць маё сэрца. У маім жыцці нямала пакут: бязрадаснае дзяцінства, галоднае батрацкае жыццё ў памешчыкаў. З малых год я пайшоў зарабляць хлеб. Сем год паліваў сваім потам панскую зямлю. Ад мяне ніколі не адступала думка: як-бы мець хоць загончык сваёй зямлі. Але зараз усе гэтыя ўспаміны змяла хваля новых, радасных пачуццяў і перажыванняў.

Тое, аб чым я марыў, збылося. Савецкая ўлада дала мне 4 гектары зямлі, карову. У доме, дзе раней жыў памешчык, мне прадастаўлена чыстая, утульная кватэра. Як-жа мне пасля гэтага не радавацца!

Я пайду сёння да выбарчай урны, каб выразіць удзячнасць вялікаму Сталіну за вызваленне нас, працоўных, з-пад ярма капіталістаў і памешчыкаў. Я буду галасаваць за сваю радасць, за радасць мільёнаў працоўных, якую далі савецкая ўлада, вялікая партыя Леніна—Сталіна, наш настаўнік і друг Іосіф Вісарыёнавіч Сталін.

Свой голас я аддам за лепшых сыноў і дачок народа, за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных. Я заклікаю ўсіх сялян галасаваць аднадушна за нашых народных кандыдатаў.

Антон Пулькоўскі,
селянін вёскі Залясяны.



КАНДЫДАТЫ Ў ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР: Бацыраў Ігнат Акімавіч і Шчукін Еўгеній Афанасьевіч

★ ★ ★

РАДАСЦЬ і ЛІКАВАННЕ

Сёння, 24 сакавіка, дзень вялікага свята працоўных заходніх абласцей БССР. Мы ўпершыню на аснове самай дэмакратычнай у свеце Сталінскай Канстытуцыі выбіраем сваіх прадстаўнікоў у соцыялістычны парламент. Гэта вялікае права мы атрымалі, дзякуючы брацкай дапамозе вялікага савецкага народа.

Былы батрак панскай Польшчы, я атрымаў вялікае права на працу. Савецкая ўлада вылучыла мяне на адказную дзяржаўную работу, забяспечыла магчымасць жыць і працаваць як належыць кожнаму з працоўных. Спачатку я працаваў старшынёй мясцовага камітэта ў г. Свіслачы, а зараз—загадчыкам аддзела соцыяльнага забеспячэння Свіслацкага раённага выканаўчага камітэта. Чэснай і адданай работай на карысць соцыялістычнай радзімы я заўсёды імкнуся выказаць сваю ўдзячнасць нашай комуністычнай партыі і Савецкаму ўраду за стварэнне для нас, працоўных заходніх абласцей БССР, свабоднага і радаснага жыцця.

Па нашых выбарчых акругах кандыдатамі ў дэпутаты Вярхоўных Советаў СССР і БССР балаціруюцца лепшыя сыны беларускага народа тт. Прытыцкі, Сеўко і Болтрык. Кожны з іх з'яўляецца кандыдатам сталінскага блока комуністаў і беспартыйных. Я з радасцю аддаю ім свой голас і ўпэўнен, што яны з чэсцю апраўдаюць вялікае давер'е выбаршчыкаў.

І. Г. Жыўлюк,
заг. аддзелам соц. забеспячэння Свіслацкага РВК.



КАНДЫДАТЫ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОУНАГА СОВЕТА БССР (злева направа): Прохараў Нікалай Іванавіч, Машэвіцкі Абрам Гешэлевіч, Пятроўская Марыя Канстанцінаўна, Грыбаедаў Нікалай Іванавіч, Іваноў Нікалай Сцяпанавіч, Семёнаў Гаўрыл Іванавіч.

ГАВОРАЦЬ ВЫБАРШЧЫКІ

ЧАМУ МЫ СЁННЯ БУДЗЕМ ГАЛАСАВАЦЬ ЗА КАНДЫДАТАЎ БЛОКА КОМУНІСТАЎ і БЕСПАРТЫЙНЫХ

ГОЛАС СЯЛЯНКІ

Сёння ў мяне вялікае свята. Я іду на выбарчы ўчастак, да ўрны, каб аддаць свой голас за нашых лепшых, сапраўды народных прадстаўнікоў.

У годы рэволюцыі дванаццацігадовай дзяўчынкай я жыла ў Расіі. Пазней, калі пераехала ў родную вёску, я часта ўспамінала аб сваіх сёстрах, якія асталіся ў СССР. Я зайздросціла ім. Нямала прышлося мне правесці бяссонных начэй, думаючы аб Совецкім Саюзе.

Доўгачаканая мара збылася. Мы назаўсёды вызвалены ад панскага прыгнёту, нашы сяляне атрымалі зямлю і вялікія правы, запісаныя ў Сталінскай Канстытуцыі.

Роўнапраўе з мужчынам атрымала і жанчына.

Сяляне выбралі мяне дэпутатам у Народнае Сабранне. У дні падрыхтоўкі да выбараў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР я была агітатарам на выбарчым участку. Расказвала сялянам аб тых заваёвах, якія дала нам совецкая ўлада. Растлумачвала ім, што толькі пры такой уладзе, як совецкая, мы змаглі вылучыць сваім кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР выхаванку прытулку, перажыўшую нястачу і голад, сялянку вёскі Копчаны, Сапоцкінскага раёна — Феафілу Міхайлаўну Дарошка.

Я з радасцю аддам свой голас за тав. Дарошка, за нашых любімых кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР тт. Прытыцкага і Пестрака. Аддам свой голас за іх таму, што яны, я ўпэўнена, змогуць па-большэвіцку служыць працоўнаму народу.

Галасуючы за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных тт. Прытыцкага, Пестрака і Дарошка, мы яшчэ раз прагаласуем за совецкую ўладу, за большэвіцкую партыю, за вялікага роднага бацьку Сталіна.

Ф. Л. Бойша,
сялянка вёскі Валя-Касцельная, Сапоцкінскага раёна.

★ ★ ★

Вялікія творчыя магчымасці

У былой Польшчы людзі, якія рашылі прысвяціць сябе мастацтву, пры першым самастойным кроку ў жыццё натыкаліся на сцяну коснасці, абыякавасці, перамешаных з прэзрэннем.

Жыць трэба было, і яны шукалі розных сродкаў: рысавалі рэкламы, размалёўвалі пакоі, рабілі шыльды. Хто прасмыкаўся перад багачамі, той мог застацца мастаком, будучы на іх жалаванні і павінен быў выконваць іх волю і жаданні.

Зразумела, што большасць талентаў гінула. Упартыя заставаліся сам-на-сам са сваімі карцінамі, туляючыся ў падвалах і на чардаках.

Совецкая ўлада зрабіла мастакоў роўнаправнымі членамі грамадства. Мы сталі састаўной часткай совецкай інтэлігенцыі, работнікамі соцыялістычнай культуры. Перад намі адкрыты велізарныя творчыя магчымасці.

Гэтымі днямі ў Беластоку адкрыецца абласная выстаўка. Лепшыя работы будуць паказаны ў Маскве ў час дэкады беларускага мастацтва.

Мастакі заходніх абласцей БССР прымалі актыўны ўдзел у выбарах Народнага Сабрання у выбарах Народнага Сабрання і ў падрыхтоўцы да выбараў дэпутатаў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР. Мы ўпаўне разумеем усю адказнасць, якая ляжыць на нас у гэтых выбарах.

Совецкі Саюз з'яўляецца адзінай сапраўды дэмакратычнай краінай, дзе ўсе грамадзяне маюць роўныя правы, дзе свабода выбараў забяспечана тайнасцю галасавання.

24 сакавіка мастакі горада выканаюць свой грамадзянскі доўг—аддадуць свае галасы за лепшых сыноў народа, за блок комуністаў і беспартыйных. У гэты дзень мы выкажам удзячнасць за нашы вызваленне і далучэнне да вялікай сям'і народаў краіны соцыялізма.

Елена Малярэвіч,
мастак гор. Беластока.

★ ★ ★

ПРЫШОЎ РАДАСНЫ ДЗЕНЬ

Для працоўных беларусоў, украінцаў, яўрэяў у Польшчы ўсе шляхі былі зачынены. Я нарадзіўся ў беднай яўрэйскай сям'і. З малых год вымушан быў зарабляць на хлеб. З вялікімі цяжкасцямі мне ўдалося закончыць сярэднюю школу і проста вялікім цудам папасці ў палітэхнічны інстытут.

З вялікімі цяжкасцямі мне ўдалося скончыць вучобу. Я зарабляў на жыццё, займаючыся чарчэннем для сынкоў багачоў, якія за грашы куплялі чужую працу і за гэта на экзаменах атрымоўвалі „выдатна“.

Але я стаў інжынерам. Аказалася, што калі ў тваіх жылах не цячэ „чыстая“ панская кроў, дык работы не атрымаеш. Доўгія гады хадзіў я без працы. Па сваёй спецыяльнасці я не меў магчымасці працаваць.

Але прышоў радасны дзень, калі старае, бяспраўнае праклятае жыццё скончылася. Прышла Чырвоная Армія і вызваліла мільёны працоўных з-пад соцыяльнага і нацыянальнага прыгнечання. Я, нарэшце, атрымаў магчымасць працаваць па сваёй спецыяльнасці, прымяніць свае веды. Зараз я працую канструктарам на механічным заводзе № 35. Прымаю ўдзел у грандыёзнай справе рэканструкцыі нашай тэкстыльнай прамысловасці.

Сваю шчырую падзяку совецкай уладзе і нашай вялікай большэвіцкай партыі я хачу выразіць, галасуючы сёння за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных, за лепшых сыноў і дачок працоўнага народа — за таварышоў Турлейскага, Кавалёна і Цанава.

Інжынер Э. Шнэйдэр.

СЯЛЯНСТВА ДАРАЖЫЦЬ СОВЕЦКАЙ УЛАДАЙ

Кім быў селянін пры праклятым панскім ладзе ў Польшчы? Хто лічыў яго за чалавека? Яго доляй была цяжкая, надрыўная праца на тое, каб расплаціцца з панам ды кулаком за даўгі, каб разлічыцца з „панствам“ за падаткі ды зборы. Селянін не меў грамадзянскіх правоў, ён нічога не ведаў у дзяржаўных пытаннях.

Я вазьму для прыкладу сваё жыццё, якім яно было пры панах. Зямлі было паўтара гектары. Хлеба не было — ідзі да пана, сена карове няма — таксама туды ж. І вясной — апрацоўваць панскае поле, і летам убіраць панскі ўраджай і ўвосень — малаціць панскі хлеб ішоў батрак і бядняк. Што ён атрымліваў за тую падняволеную працу? Толькі каб не памерці з голаду.

Бывала, у польскім „панстве“ надыходзілі выбары ў сейм і сенат. Загадзя паны намячалі сваіх кандыдатаў знатных, радавітых князёў і графаў, пачотных шляхціцаў. Эксплаататары выстаўлялі эксплаататараў. Народ не ведаў, за каго заклікалі, а правільней, прымушалі галасаваць. Затое такое было і галасаванне. Бывала, кулак запрэжэ каня і едзе галасаваць. Ехаў ён з гонарам, бо ведаў, што яго інтарэсы не будуць парушаны. А народу не было ніякага інтарэсу ісці галасаваць за панскіх кандыдатаў.

Польскія ўлады заўсёды бралі на заўвагу людзей, якія не ішлі галасаваць. Ездзіць, бывала, панскі кандыдат па вёсках, па мястэчках, наабяцае кучу дабра, абы толькі галасавалі за яго. А пасля выбараў... Хто не прымаў удзелу ў галасаванні, глядзі — і ідзе да цябе войт ці солтыс і ўжо абавязкова знойдзе прычэпку ўкляіць штраф. Сабака не назвязаны — штраф пяць злотых, комін не пабелены — таксама штраф, двор не падмецены — пішуць акт. А потым прыходзіць секвестратар—спаганяе.

Праклятае панства выгнана з нашай зямлі. Мы, бедныя, жывём свабодна, атрымалі ад совецкай улады зямлю. І мы будзем працаваць на ёй так, каб быць дастойнымі нашых братоў-калгаснікаў. Нашы сяляне самі зараз арганізоўваюць чырвоныя абозы з хлебам. Нядаўна ў нашай вёсцы Эймінаўцы быў арганізаван чырвоны абоз.

Нашы сяляне добра разумеюць цану совецкай уладзе і гатовы за яе гарой стаяць. Мы дружна ідзём на выбары сваіх прадстаўнікоў у Вярхоўныя органы совецкай улады. Сёння мы аддаём свае галасы за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных. Усе беларусы, палякі, — як мы дружна жывём, так дружна пойдзем галасаваць за совецкую ўладу, за вялікага правадыра і бацьку таварыша Сталіна.

Антон Зданчук,
селянін бядняк вёскі Эймінаўцы, Вяліка-Берастовіцкага сельсовета, Крынскага раёна.

★ ★ ★

ЗДАБЫТАЕ ШЧАСЦЕ НАСТАЎНІКА

Я мог-бы многа расказаць аб школе і аб умовах, у якіх жыў і працаваў настаўнік у былой Польшчы. Настаўніка эксплаатавалі. Яго часта прымушалі „пакравіцельстваваць“ над сынкамі багачоў, г. зн. «выцягваць» дзяцей вядомых паноў. А за плячамі настаўніка стаяла грозная цень інспектара. Цікавіўся яго работай камендант «Стралецкага саюза», кіраўнік ОЗН, паліцэйскі і ксёндз. Інспектар ставіў яму адзнакі за работу, камендант «Стральца» напамінаў яму яго «грамадзянскія» абавязкі, кіраўнік ОЗН запісваў без яго ведама ў члены саюза, паліцэйскі наглядаў, ці не вядзе ён рэволюцыйнай работы, а ксёндз клапаціўся аб яго маральнасці і правяраў, ці наведвае ён сістэматычна касцёл. Настаўнік не мог нават і марыць аб тым, каб даць моладзі сапраўдную навуку. У такой абстаноўцы гінула ўсякая ініцыятыва, настаўнік станавіўся бяздушным і схематычным.

Туберкулёз быў самай папулярнай хваробай сярод настаўнікаў. Хіба гэта дзіўна, калі школьныя класы былі нізкія, цёмныя, перапоўненыя, калі на аднаго настаўніка прыходзілася звыш 80 вучняў.

Цяпер усё гэта мінула, як кашмарны сон. Сёння вучоба даступна для ўсіх. У школах навучаюцца ўсе дзеці працоўных. Настаўнік стаў будаўніком комунізма. Ён выхоўвае маладое пакаленне, здольнае канчаткова ўстанавіць комунізм.

Вялікая партыя большэвікоў і Совецкі ўрад акружаюць настаўнікаў найвялікшымі клопатамі. Створаны ўсе ўмовы для інтэлектуальнага развіцця настаўнікаў, магчымасці для навышэння іх кваліфікацыі. Курсы, завочнае абучэнне, даклады і лекцыі даюць магчымасць наглыбляць свае веды.

У былой Польшчы за год да прыходу Чырвонай Арміі я кінуў работу ў школе, таму што я душыўся ў гнілой атмасферы. Цяпер я здабыў сваё шчасце і з радасцю вярнуўся да сваёй любімай прафесіі.

Сёння я прыду да выбарчай урны і аддам свой голас за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных, бо іх біяграфіі гавораць аб тым, што яны з'яўляюцца лепшымі сынамі працоўнага народа, бо яны змогуць апраўдаць яго давер'е і будуць заўсёды абараняць яго інтарэсы. Я глыбока ўпэўнен, што ля выбарчых урнаў не будзе адсутных: усе настаўнікі аддадуць свае галасы за блок комуністаў і беспартыйных.

В. С. Сабірайскі,
завуч 13 школы г. Беластока.

ГОРДАСЦЬ СОВЕЦКАЙ МОЛАДЗІ

Немагчыма апісаць тую радасць, з якой мы сустракаем сённешні дзень — дзень выбараў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР.

Мы гардзімся тым, што нас лічаць дарослымі і поўнапраўнымі грамадзянамі, што нам 18-гадовым аказваюць такое велізарнае давер'е, як удзел у галасаванні пры выбарах вярхоўных органаў дзяржаўнай улады.

Бязмерна высока гардзімся мы тым, што з'яўляемся грамадзянамі самай моцнай, самай шчаслівай у свеце краіны — Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік.

Гэтыя вялікія правы нам дала совецкая ўлада.

Падумаць толькі! Мы карыстаемся ўсімі грамадзянскімі правамі, запісанымі ў залатой Сталінскай Канстытуцыі. Асабліва нас радуе атрыманае намі шырокае права на асвету: вучымся бясплатна ў сярэдняй школе, увосень гэтага года зможам паступіць у любую вышэйшую навучальную ўстанову СССР.

Няма ў свеце моладзі шчаслівей нас, шчаслівей совецкіх юнакоў і дзяўчат.

Ці маглі мы думаць аб такім давер'і, аб такіх правах, аб такім шчасці ў былой панскай Польшчы? Пізашто! Ніколі! Па польскіх законах мы не лічыліся б за грамадзян яшчэ шэсць год. У буржуазнай дзяржаве мы маглі-б і зусім не мець права голасу, не мець ніякіх грамадзянскіх правоў.

У адказ на правы, прадастаўленыя нам большэвікамі, мы абяцаем быць дастойнымі совецкімі грамадзянамі. Сярэднюю школу пастараемся закончыць толькі на «выдатна». У вышэйшай школе будзем вучыцца таксама прыкладна, каб стаць поўнацэннымі совецкімі спецыялістамі.

У адказ на правы, прадастаўленыя нам совецкай уладай, сёння мы з выключнай радасцю і гордасцю аддадзім упершыню ў жыцці свае галасы за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных, за наша новае жыццё, за наша шчасце, за нашу вызваліцельніцу — вялікую комуністычную партыю Леніна—Сталіна.

Леў Скакоўскі, Стэфанія Шаўзіна,
вучні 10 класа сярэдняй школы № 1 гор. Беластока.

★ ★ ★

Свабодны грамадзянін

Яўрэйскі актор у былой панскай Польшчы быў пад двайным прыгнётам: як яўрэй і як артыст. Наша экзістэнцыя залежала ад першага антысеміта-чыноўніка з староства, ад капрызаў рознага роду канцылярскай швалі. Не было граніц свавольству і агіднасцям гэтых „паноў“. Круг дзейнасці яўрэйскага актора рознымі шляхамі, законнымі і незаконнымі, звужаўся, што ў выніку штурхала нашы творчыя сілы ў балота халтуршчыны. Беспрацоўе, нястача, голад былі пастаяннымі спадарожнікамі яўрэйскага актора.

Яўрэйскі тэатр у Польшчы напярэдадні вайны меў у сваім распараджэнні толькі 6 канцэсій, якія ледзь-ледзь маглі ахваціць 80 актораў, у той час, як у яўрэйскай акторскай сям'і былой Польшчы налічвалася 250 вядомых імён.

Доблесная Чырвоная Армія вызваліла нас з ланцугоў безвыходнай галечы. Прыбіты, заплёваны, абяздолены яўрэйскі актор цяпер свабодны і шчаслівы. Ён мае вялікія магчымасці для творчай радаснай работы на карысць народа і радзімы.

Цяпер я працую ў Дзяржаўным Яўрэйскім тэатры мініятур. Я не пасынак лёсу, які жыве па ласцы пустых надзьмутых паноў. Мая мара—стаць патрэбным, творчым работнікам. Я глыбока веру, што толькі цяпер я нарадзіўся для мастацтва.

Я прышоў да выбараў як свабодны грамадзянін, гатовы будаваць новае жыццё, тварыць вялікую справу, якую творыць партыя Леніна—Сталіна.

Галасаваць я буду за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных таму, што яны закліканы і бясспрэчна будуць абараняць мае культурныя і соцыяльныя інтарэсы. Я звяртаюся з заклікам да ўсіх актораў, да ўсіх работнікаў мастацтва, каб яны галасавалі за блок комуністаў і беспартыйных.

І. Бергман,
артыст Дзяржаўнага Яўрэйскага тэатра.

★ ★ ★

ПАРТЫЯ ДАЛА МНЕ НОВАЕ ЖЫЦЦЁ

Вось ужо трэці год, як я працую вартаўніком на суконнай фабрыцы ў Беластоку.

Зараз гэта фабрыка ўваходзіць у састаў 1-га тэкстыльнага камбіната: перад нацыяналізацыяй яна належала фабрыканту Фуксу.

Цяжка жылося мне ў былой Польшчы. Працаваў я па 18 гадзін у суткі. Я павінен быў ахоўваць чужую фабрыку, таніць у кацельней, прыбіраць, выконваць некаторы дробны рамонт, а акрамя таго я яшчэ сек дровы для пана Фукса. Спаў я тады па 3—4 гадзіны ў суткі.

Ды хіба гэта было жыццё? Зараз усё змянілася. Цяжкое мінулае ўжо больш ніколі не вернецца.

Я працую вартаўніком на тым-жа прадпрыемстве, але зараз ужо не ахоўваю прыватнай уласнасці. Няма тут пана Фукса і ніколі ён больш не вернецца. Я ганаруся тым, што ахоўваю зараз соцыялістычную маёмасць і абяцаю пільна даглядаць яе.

Працую я зараз па 8 гадзін у суткі, жывецца мне радасна і вольна. Я ведаю, што гэта новае вольнае жыццё дала мне доблесная Чырвоная Армія, большэвіцкая партыя і совецкая ўлада.

Я заклікаю ўсіх рабочых 24 сакавіка аддаць свае галасы за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

Р. Каган,
вартаўнік фабрыкі.

АД ТАСС

ТАСС упаўнаважан заявіць, што распаўсюджваемыя рознымі замежнымі агенцтвамі чуткі аб маркуемым прыездзе Старшыні Соўнаркома СССР таварыша Молатава ў Берлін, або ў адзін з гарадоў Германіі ці Заходняй Украіны, — пазбаўлены ўсякай падставы.

НА ЗАХОДНІМ ФРОНЦЕ

ПАРЫЖ, 23 сакавіка (ТАСС). Афіцыяльна паведамляецца, што ўчора на фронце не адбылося нічога новага. Ноччу заўважалася актыўнасць патрулей к усходу ад лініі Саар.

БЕРЛІН, 23 сакавіка. (ТАСС). Вярхоўнае камандаванне германскай арміі паведамляе: «На заходнім фронце ніякіх асаблівых падзей. Не гледзячы на моцны агонь зенітнай артылерыі і дзеянні знішчальнай авіяцыі праціўніка, германскія самалёты рабілі ўчора разведку над Францыяй. Некалькі разведчых самалётаў праціўніка ляталі над заходняй граніцай Германіі. У раёне Клеве германскімі знішчальнікамі збіт англійскі самалёт. У ноч з 22 на 23 сакавіка самалёты праціўніка парушылі нейтралітэт Галандыі, Бельгіі і Люксембурга».

ЛОНДАН, 23 сакавіка. (ТАСС). Па паведамленню агенцтва Рэйтэр, учора паблізу Лобіта (Галандыя) завязаўся бой паміж 4 англійскімі і 7 германскімі самалётамі. Тры англійскіх самалёты набралі вялікую вышыню, а чацверты, папаўшы ў акружэнне трох германскіх самалётаў, быў збіт і зваліўся ў раку Вааль. Яго экіпаж да гэтага часу не знойдзен.

ПАВЕДАМЛЕННЕ НАРВЕЖСКАГА МІНІСТЭРСТВА ЗАМЕЖНЫХ СПРАЎ

СТАКГОЛЬМ, 23 сакавіка. (ТАСС). Нарвежскае міністэрства замежных спраў апублікавала заяву, у якой указваецца, што 8 сакавіка нарвежскі пасланнік у Берліне перадаў германскаму міністэрству замежных спраў ноту. У гэтай ноце Нарвегія заяўляе, што яна сочыць з вялікім непакоем за ходам вядзення вайны, у выніку якой быў патоплен рад нарвежскіх параходаў. «Нарвежскі ўрад лічыць, — гаворыцца ў ноце, — што ён мае права патрабаваць, каб судны нейтральных краін, якія перавозяць грузы ў Нарвегію, не падвяргаліся-б рыску быць атакаванымі германскімі ваеннымі сіламі». У заключэнні мяркуецца склікаць нараду з прадстаўнікоў абодвух краін для таго, каб «зрабіць менш небяспечнай нарвежскі марскі гандль і забяспечыць снабжэнне Нарвегіі».

Становішча ў Іспаніі

Англійскі журнал «Эканаміст» паведамляе, што Іспанія мае ўмацаваную лінію ўздоўж сваёй паўночнай граніцы. Вядуцца работы па прадоўжанню да каталонскай граніцы ўмацаванняў, якія пабудаваны 17 месяцаў таму назад у баскскай часці Пірэнеяў. На гэтай рабоце занята некалькі тысяч зняволеных каталонцаў. У сувязі з тым, што ў час вайны было забіта каля аднаго мільёна чалавек, 400 тысяч у выгнанні і каля аднаго мільёна ў канцэнтрацыйных лагерах, прамысловасць і сельская гаспадарка Іспаніі пазбавіліся вялікай колькасці рабочай сілы.

Адным з асноўных фактаў эканамічнага жыцця з'яўляецца поўны заняпад каталонскай прамысловасці.

23 сакавіка. (ТАСС).

НАПЯРЭДАДНІ ПАРЛАМЕНЦКІХ ВЫБАРАЎ У КАНАДЗЕ

НЬЮ-ЙОРК, 23 сакавіка. (ТАСС). 26 сакавіка ў Канадзе адбудуцца парламенцкія выбары. На 245 месц вылучана 672 кандыдаты, у тым ліку 10 камуністаў і некалькі кандыдатаў фермерска-рабочай і іншых прагрэсіўных груп. Ліберальная партыя, маючая большасць у старым саставе парламента, вылучыла 240 кандыдатаў, кансерватыўная — 213, соцыял-дэмакратычная (так званая кааператыўная федэрацыя) — 98. Соцыял-дэмакратычная партыя выступае за працяг вайны. Толькі кандыдаты кампартыі і фермерска-рабочай партыі адкрыта выступаюць за спыненне вайны.

ЗА РУБЯЖОМ

Агенцтва Рэйтэр паведамляе, што 21 сакавіка было падпісана англа-галандскае гандлёвае пагадненне.

* * *

У Сафію прыбыў амерыканскі пасланнік Эрль. Пост амерыканскага пасланніка быў вакантным амаль год.

* * *

У Берлін прыбылі 9 германскіх падданых, знятых англічанамі з парахода «Асама-Мару» і затым вызваленых.

* * *

У раёнах Турцыі, пацярпеўшых ад землетрасення, разбурана 80 тысяч дамоў.

* * *

Японскі суд прызнаў арыштаванага карэспандэнта амерыканскага агенцтва «Інтэрнейшынэл ньюс сервіс» Юнга вінаўным у распаўсюджванні хлуслівых чутак і прыгаварыў яго да 6 месяцаў турэмнага зняволення. Выкананне прыгавору пакуль спынена.



Кадр з фільма «Член урада». Заслужаная артыстка РСФСР В. Марэцкая — выканаўца галоўнай ролі калгасніцы Александры Сакаловай.

КІНО

„ЧЛЕН УРАДА“

Новы совецкі кінофільм «Член урада» з'явіўся на экране Беластока. Ён паспеў вельмі своечасова. Як раз цяпер нашы вызваленыя грамадзяне заходніх абласцей выбіраюць народных прадстаўнікоў у вярхоўныя органы совецкай улады. Сцэнарыст К. Вінаградава і рэжысёры Зархі і Хейфіц — вялікія майстры совецкага кіно — зусім не прыўрочвалі да гэтага свой натхнёны мастацкі твор, але жыццё, з такой мастацкай сілай у ім паказанае, вельмі падобна да тых соцыяльна-грамадскіх з'яў, якія адбываюцца на вызваленым захадзе совецкай краіны.

Простая руская сялянка. Працавітая, чэсная, з вялікім прыродным розумам, з выключна благароднымі душэўнымі якасцямі і незгінаемай воляй — такая бядначка Александра Сакалова. Ворагі калгасаў за яе рэзкае выступленне супроць так званых «лявацкіх» перагібаў у калгасным руху ўзводзяць паклёп на яе як на кулачку. Але чэсная сялянка знаходзіць праўду, абарону ў сакратара райкома партыі, ролю якога іграе артыст Б. Блінаў, вядомы па ролі Фурманава ў фільме «Чапаеў». І гледзячы на экран, мы нібы сваёй істотай прысутнічаем там, у горніле зараджэння новага жыцця працоўнага сялянства, супроць чаго вядуць такую хітрую і подлую дзейнасць варожыя народу элементы.

Да кіраўніцтва маладым калгасам пры падтрыманні райкома партыі стала Александра Сакалова. Гэта не просты шлях да кіраўніцтва масамі, гэта перанесеная вялікая барацьба з супраціўленнем тых, хто не жадаў жыцця калгасу, а значыць не хацеў у яго кіраўніцтве чэсных людзей. Гэта вынесеная і найвялікшая сямейная драма, калі муж рашуча супраціўляецца Александры станавіцца старшыняй калгаса. Гэта была моцная сям'я, але мацней за ўсё аказаліся грамадскія перакананні супругаў, што і прывяло да маральна балючага разрыву.

Далей разгортваецца прытоеная, падкалодная змяіная дзейнасць галоўнага арганізатара сабатажу калгаса— «агранома» Крывашэева. Гэта ён, напытаны бухарынскіх брэдняў, падрывае галоўнае ў калгаснай арганізацыі — працоўную дысцыпліну. Яго варожыя «ціхія» канцэпцыі падхапляюць лодыры, якія гатовы былі жывіцца з грамадскага засека. Толькі да пары гэта было, бо чэсныя працаўнікі сурова асадзілі дармаедаў. Сродак для гэтага знайшла сама, без усякага падтрымання, наадварот, пры супраціўленні калгаснага «актыва», старшыня калгаса, малапісьменная Сакалова. Яна ўдарыла па лодырах устанаўленнем аплаты па працы. Супраціўленне тут узнікла яраснае, але мацней была ярасць чэсных калгаснікаў, сіла якіх перамагла.

Дружнай агульнай працай чэсныя калгаснікі вывелі сваю калектыўную гаспадарку на шлях росквіту. Калгас нажыў вялікае багацце. І ў гэтым працавітым катле перавыхаваліся былыя лодыры, якія былі раней збіты з вернага шляху кулацкім агентам. Калгас заслужыў славу перадавога ў раёне.

Да гэтай радасці, купленай агнём сваёй упартай натуры і кроўю свайго чэснага сэрца, у Сакаловай дадалася асабістая радасць у тым, што вярнулася яе жаночае шчасце разам са вяртаннем «з прочак» яе мужа Ефіма. Колькі праўдзівай, непасрэднай шчырасці ў гэтых кадрах цяжкай псіхалагічнай барацьбы, сардэчнай цеплыні і чыстаты! Ефім Сакалоў быў чэсны чалавек, бядняк, і выступаў ён супроць жонкі — старшыні калгаса толькі ў сілу сваіх косных поглядаў мужчыны. Цяпер ён пабароў у сабе гэту коснасць, праўда жыцця яму біла ў вочы, адкрыўшы ім сапраўдную ісціну. Ён прымірыўся, але гэта не простая пакора любімай жонцы, гэта глыбока ўсвядомлены пераход, рашучы крок да сумеснай барацьбы і працы. Гэта адна з мацнейшых карцін фільма, у якіх так праявіліся артысты Вера Марэцкая і В. Ванін.

І тут вораг робіць апошнія натугі надарваць жыццёвую сілу калгаса, якая заключалася ў сіле яго кіраўніцтва. Гэта апошняя звярыная натуга ворага і з'явілася пагібеллю для яго самога. У бяссільнай трусасці ён страляе ў Сакалову. Ефім Сакалоў выкрывае подлага гада.

Прайшоў час. Сакалова даўно папраўлялася. Калгас ачысціўся ад усяго варожага. Выраслі новыя кадры — кадры, выхаваныя Сакаловай. І ці не ім быць так па-сыноўняму ўдзячнымі сваім ростам свайму старшыні — жанчыне. Гэта іх перадавая думка і спынілася на асобе Александры Сакаловай, калі ўвесь народ выстаўляў сваіх кандыдатаў у Вярхоўны Совет Саюза. Народ выбраў Сакалову дзяржаўным дзеячом — дэпутатам Вярхоўнага Совета. У гэтым вяршыня чалавечага шчасця, якога дасягаюць людзі вялікага сэрца, крышталёвай душэўнай чыстаты, непахіснай волі да лепшага для людзей. І на трыбуне Вярхоўнага Совета, выступаючы перад роўнымі з сабой выбраннікамі вялікага працоўнага народа, Сакалова заявіла знамянальныя словы аб уваскрашэнні чалавечай годнасці раскрэпаленай жанчыны. Гэта быў вялікі голас яе сэрца, і таму голасу быў адказ — голас захаплення тысячнай аўдыторыі народных дэпутатаў, быў адказ — цёплы позірк правадыра, якога тут яна ўпершыню ўбачыла.

Вялікія, моцныя страсці чалавека, страсці высокія і так праўдзіва паказаныя ў гэтым фільме магутнай сілай мастацтва. Гэты фільм трэба паказаць у вёсцы, дзе вызваленае сялянства перажывае зараз тыя-ж грамадскія зрухі, што дзесяць год таму назад адбываліся і ў іх братоў — калгаснікаў Совецкага Саюза. Гэты фільм трэба паказаць шырокім масам, якія зараз галасуюць за сваіх народных кандыдатаў у Вярхоўныя Советы. Гэтыя масы таксама вылучылі з свайго асяроддзя выдатных жанчын, такіх, як Максімюк, першая жанчына старшыня калгаса ў нашай вобласці, і іншых выдатных прадстаўніц вызваленага народа.

І. Клінаў.

БЕЛАСТОК У ДЗЕНЬ ВЫБАРАЎ

РАДЫЁПЕРАДАЧЫ

У дзень выбараў Мінская і Баранавіцкая радыёстанцыі трансліруюць з Беластока спецыяльны выпуск апошніх паведамленняў аб ходзе выбараў.

Перад мікрафонам выступяць выбаршчыкі на рускай, польскай і яўрэйскай мовах.

Сёння-ж будзе дана спецыяльная літаратурная радыёперадача, прысвечаная выбарам, на яўрэйскай і польскай мовах.

Акрамя таго Беластоцкі радыёкамітэт арганізуе сёння некалькі канцэртаў мастацкай самадзейнасці, якія будуць трансліравацца Баранавіцкай радыёстанцыяй з выбарчых участкаў.

ФІЗКУЛЬТУРНІКІ

У час выбараў гарадскі камітэт фізкультуры і спорту арганізуе ў Беластоку рад сустрэч па баскетболу і валейболу. У гэтых сустрэчах прымаюць удзел каманды спартыўных таварыстваў «Спартак», «Харчавік» і вучні Беластока.

Сустрэчы пройдуць у памяшканнях 1-й сярэдняй школы і педвучылішча.

ШАХМАТЫСТЫ

Сёння ў Беластоцкім шахматным клубе адбудзецца рад сеансаў адначасовай ігры на накалькіх дошках.

Адзін з лепшых беластоцкіх шахматыстаў тав. Клеменціноўскі сыграе адначасова з 20 праціўнікамі.

КІНО

24 сакавіка ва ўсіх 23 кінотэатрах вобласці адбудуцца кінасеансы для выбаршчыкаў па спецыяльнай праграме.

Акрамя таго 12 кіно-перасовак будуць абслугоўваць усе населеныя пункты вобласці, з іх: дзве па гор. Беластоку, адна — у г. Гродне, астатнія — у сельскіх мясцовасцях.

КАНЦЭРТЫ, МАСАВЫЯ ГУЛЬНІ, ТАНЦЫ

На 53 выбарчым участку Пралетарскай акругі, які знаходзіцца ў памяшканні клуба тэкстыльшчыкаў, увесь дзень будуць праходзіць канцэрты і выступленні мастацкай самадзейнасці.

У праграме выступленняў: канцэрты духавога аркестра, джаз-аркестра, масавыя гульні, танцы, паказ кіно-карцін. Выступленні пачнуцца ў 6 гадзін раніцы канцэртам духавога аркестра клуба тэкстыльшчыкаў.

Раёны вобласці рыхтуюцца да абласной алімпіяды

Мастацкія калектывы і індывідуальныя выканаўцы Беластоцкай вобласці энергічна рыхтуюцца да ўдзелу ў абласной алімпіядзе мастацкай самадзейнасці. У раёнах і сельсоветах праходзяць прагляды мастацкай самадзейнасці. Лепшыя сілы адбіраюцца на абласную алімпіяду. У многіх раёнах прагляды ўжо закончаны.

У Бельскім раёне вылучаецца хор вёскі Грабоўцы ў саставе 22 чалавек. На раённым праглядзе хор атрымаў прэмію за добрае выкананне народных і совецкіх песень. Добры хор з 63 чалавек арганізаван у горадзе Бельску. За лепшае выкананне песень „Ночанька“, „Жураўлі“, „Бульба“ і інш. хор атрымаў на праглядзе 2.400 рублёў прэміі. Мастацкая самадзейнасць Бельскага раёна разнастайная: ёсць танцавальныя калектывы, камерны аркестр, многа індывідуальных выканаўцаў. Танцоры Панько і Гіжэўскі, скрыпач-саліст Ціневіцкі, разказчыкі і дэкламатары прадстаўляюць лепшыя сілы народнай творчасці. 80 чалавек Бельскага раёна прымуць удзел у абласной алімпіядзе.

У Саколкаўскім раёне вылучаецца хор з мястэчка Саколкі ў саставе 50 чалавек а таксама ансамбль песні і пляскі пад кіраўніцтвам Максіменка і Андросава. Вёскі Саколкаўскага раёна пашлюць на раённы прагляд, які адбудзецца 26 сакавіка, многа індывідуальных выканаўцаў: народных спевакоў, танцораў, музыкантаў.

На жаль, у сельсоветах дрэнна арганізаваны калектывы мастацкай самадзейнасці. Зусім няма кіраўнікоў гурткоў, раённы камітэт комсамола не дапамагае ў разгортванні мастацкай самадзейнасці.

На праглядзе ў Дамброўскім раёне быў цэлы рад здольных людзей, але яны не маглі нічога прадэманстраваць з-за адсутнасці інструментаў. Зусім не арганізавана мастацкая самадзейнасць у вёсках Дамброўскага раёна і ён не будзе прадстаўлен на абласной алімпіядзе ні адным калектывам.

Абласная алімпіяда мастацкай самадзейнасці павінна даць штуршок усім адстаючым раёнам у разгортванні мастацкай самадзейнасці.

Л. Лірская.

Адказны рэдактар
Б. М. ЗЕЛЬМАНАЎ.

Адрас рэдакцыі і выдавецтва: г. Беласток, будынак Аблвыканкома. Тэлефоны рэдакцыі: адказнага рэдактара — 22 (па камутатару аблвыканкома) і 49 (гарадскі), сакратарыята, партыйнага і совецкага аддзелаў — 23 (па камутатару аблвыканкома), прамысловага, сельскагаспадарчага, культурнага і інфармацыйнага аддзелаў — 17-62 (гарадскі), Тэлефон выдавецтва і аддзела аб'яў — 16-10, Тэлефон друкарні і начной рэдакцыі — 5-21.
Падпіску на газеты прымае «Саюздрук» (Тэлефон 5-14).

Упаўнаважаны абліта № 420. 1-я дзяржаўная друкарня ў г. Беластоку.